**Адразу тры (але вельмі розныя!) мастацкія экспазіцыі можна наведаць сёння ў галерэі Палаца Рэспублікі "Універсітэт культуры": "Пункт погляду", "INTRO" і "Вясновыя святы".**

# INTRO... INTRO... INTRO...



Андрэй Скіцёў. "Паліна і цень", 2008 (графіка).



Ала Пугач. "На полі О", 2008 (калаж).



Таццяна Вельт. Без назвы, 2008 (святлапіс).

Першая экспазіцыя "Пункт погляду" — гэта адмысловы заклік параўнаць разуменне сутнасці мастацтва і наогул светаўспрыманне прадстаўнікоў розных пакаленняў творцаў. "Пункт погляду" сёняшніх 20-гадовых мастакоў на жыццё, час і людзей прадстаўлены калажнымі работамі, створанымі студэнтамі Інстытута сучасных ведаў, многія з якіх з'яўляюцца лаўрэатамі фэшн-фестываляў ("Млын моды", "Мамант" і інш.). А эстэтычныя ідэалы сёняшніх 40-гадовых мастакоў перадае ў сваіх работах іх выкладчык, вядомы беларускі графік Андрэй Скіцёў.

Здавалася б, паміж гэтымі двума пакаленнямі пралягло цэлых дваццаць гадоў, што нямала і ў гістарычным, і нават у мастацтвазнаўчым сэнсе. Многае змянілася за гэты час — як функцыі і роля саміх мастакоў, так і сродкі і іх выяўленчыя магчымасці; урэшце, за апошнія дваццаць гадоў і постмадэрн ужо, як сведчаць некаторыя гісторыкі мастацтва, паспеў саступіць месца "мультыкультурнай сітуацыі"... Ды вось неяк адразу і не скажаш, пабыўшы на выставе, хто з іх больш "сучасны": саракагадовы Андрэй Скіцёў ці яго юныя студэнты. Ва ўсякім разе ў аўтара гэтых радкоў менавіта графіка Скіцёва пакінула сапраўднае, непадробнае адчуванне паўнаты жыцця ды разняволенасці маладосці, іншымі словамі, вядомых яшчэ з часоў Максіма Багдановіча "маладых гадоў і маладых жаданняў". Спакуслівая таемнасць юнай прыгажуні ў... парваных джынсах ("Спакуса"), крыху разгублены ці здзіўлены погляд іншай юнай гераіні з ярка-чорнымі прамымі пасмамі ("Эма"), задуменнасць маладога чалавека, што едзе ў пустым аўтобусе і чытае зборнічак вершаў ("Сакавік"), асалода ад прадчування руху ("Паліна і цень"), маўклівая гармонія двух закаханых ("Дотык") — гэтыя і многія іншыя "выхапленыя" з рэальнага жыцця карцінкі без пафасу і крыклівасці выдатна адлюстроўваюць розныя станы і захапленні сучаснага маладога чалавека...

А што тым часам стракатыя калажы студэнтаў? У тым і справа, што, як падалося, занадта стракатыя. Быццам "кліпы" ці "ролікі" (у некаторых калажах і сапраўды можна пазнаць кліпы модных сёння поп- і рок-гуртоў), а дакладней кажучы — пакуль што толькі "нарэзка" для яшчэ не здзейсненых твораў. Назвы асобных калажаў гавораць самі за сябе, як, напрыклад, "Усё наша жыццё — гульня" (Вольга Семчанка). Нехта "выдаў" сябе праз наклееныя цытаты вялікіх, як, да прыкладу, Марына Барташ, што згадала Юнга: "Мы не саграшым супраць праўды, сказаўшы, што персона — гэта тое, чым чалавек у сапраўднасці не з'яўляецца, ды ў той жа час тое, чым ён сам, роўна як і іншыя, сябе лічыць". Зрэшты, уражанне адмысловых іскрынак на такім "імперсаніфікаваным" фоне ўсё ж зрабілі некаторыя творы: калаж той жа Марыны Барташ "Жоўты аўтобус" з алюзіяй на бітлоўскую жоўтую субмарыну або калаж Алены Брагінай "Залюстрэчча" з двайным намёкам — і на казачную краіну Алісы, і на тое вусцішнае замагільнае залюстрэчча, куды трапляе пасля смерці кожны чалавек...

Аўтар і герой другой экспазіцыі "INTRO" — малады фотамастак Таццяна Вельт. Як паведамляюць арганізатары выставы, Таццяна кідае выклік мастацкім канонам. Яе галоўны мастацкі сродак — так званы светлавы пэндзаль, а "палатно" — лічбавая матрыца. У выніку нараджаецца своеасаблівы "святлапіс" — свет эмоцый і адчуванняў, дзе ўсё падаецца ілюзорным і фантастычным, дзе хочацца заблукаць, але варта толькі наблізіцца — паверхня вады разбіваецца, і ілюзія знікае. У тым, як Таццяна стварае свае неардынарныя работы, яна прызналася, вобразна вызначаючы паэтычную квінтэсенцыю экспазіцыі: "Ноч, гучыць музыка, у куфлі плавяцца кубікі лёду. Па тонкай крыштальнай ножцы спаўзае кропля. Вада? Сляза? Яшчэ імгненне — і яна ўпадзе, разаб'ецца аб паверхню стала. Але кропля трапляе ў промень святла і выбухае калейдаскопам неонавых агнёў. INTRO". Гэтакія "ўводзіны" ў свет фантазій маладога фотамастака, дзе ўладараць тры боствы: святло, колер і вада...

Нарэшце, трэцюю экспазіцыю "Вясновыя святы" прадставілі студэнты кафедры народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў. Усе творы тут (габелены, вышыўка, кераміка, вырабы з саломы і інш.) аб'ядноўвае адна тэма — тэма вясны. Адпаведна і "жыхарамі" гэтага цудоўнага вясновага сусвету аказваюцца тыя, хто ўсю зімовую пару чакаў прыходу вясны і сонца: блакітныя азёры, кветкі, расліны, зоркі, кузуркі... Экспазіцыя "Вясновыя святы" насамрэч вылучаецца асаблівай вытанчанасцю і далікатнасцю. Гэта таксама, можна сказаць, адмысловае "intro" — ды ўжо не ў асабісты творчы свет асобнага мастака, а наогул у неабсяжны свет эстэтычных ідэалаў беларусаў.

**Мікола ЧЭМЕР.**
**Фота Алега ІГНАТОВІЧА.**